*В. С. Болбас, Т. У. Гурын (г. Мазыр)*

## ЯКУБ КОЛАС АБ УПЛЫВЕ ЭСТЭТЫЧНАГА ВЫХАВАННЯ НА МАРАЛЬНАЕ РАЗВІЦЦЁ АСОБЫ

Усе творы Якуба Коласа ўтрымліваюць істотны маральна-эстэтычны выхаваўчы патэнцыял: яны вучаць любіць жыццё, цаніць яго радасці і змагацца за іх. У вершах паэта, у яго паэмах і апавяданнях у якасці асноўнага героя выступае чалавек працы. І гэты герой не пасіўная асоба, у ім абуджаецца ўсве-





дамленне сваёй сілы, годнасці і вартасці. Ён не мірыцца з тым, што стваральнік усяго каштоўнага, неабходнага для жыцця, гібее ў галечы і беднасці, не можа задаволіць сваіх чалавечых патрэб. У гэтым і выражаецца коласаўская ідэя выхавання такой маральнай якасці як чалавечая годнасць, выхавання чалавека, які зможа адстаяць яе ў барацьбе з сіламі зла.

Сфера праяўлення коласаўскай ідэі прыгажосці — гэта вобласць народнага жыцця. Вызначаючы яе сутнасць, можна сказаць, што прыгожыя, па Коласу, сіла і магутнасць народа, яго стваральная дзейнасць, духоўная чысціня і маральная веліч простага чалавека працы.

Характар коласаўскай ідэі прыгажосці неадрыўны ад яе патрыятычнага, нацыянальнага гучання. Я. Колас старанна даследуе абставіны духоўнага жыцця беларуса і знаходзіць, што ў маральных адносінах беларускі селянін аказваецца вышэй паноў, што яму не толькі знаёмы ўсе лепшыя праяўленні чалавечых пачуццяў, а ён надзелены імі ў вышэйшай ступені. Значнымі ўяўляюцца магчымасці твораў Я. Коласа ў выхаванні патрыятызму.

Патрыятызм Коласа праяўляецца і ў паказе роднай прыроды, злітнасці з ёй чалавека. Шчасце яднання з прыродай нараджае і духоўнае пачуццё ў душы чалавека — гэта адносіны да працы. Колас вучыць любіць працу, бо, як ён лічыць, праца — вышэйшая асалода жыцця. Яна ўзвышае чалавека, робіць яго духоўна багатым.

Паэт сцвярджае і такую маральную якасць як непрымірымасць да чалавечых заган, да ўсялякага зла. Акцэнтуе Я. Колас увагу і на выхаванні такіх маральных якасцей як любоў да свабоды, усведамленне сваёй чалавечай годнасці і, разам з тым, сціпласць, паслядоўнасць, разважлівасць. Прычым, на думку паэта, патрэбны гэтыя якасці чалавеку для актыўнай стваральнай дзейнасці і барацьбы за свае правы.

Духоўная адаронасць яго герояў праяўляецца ў асэнсаванні імі сваёй сілы і ролі ў жыцці. Аўтар паказвае цяжкі і складаны шлях развіцця самасвядомасці героя,ператварэнне яго ў чалавека-змагара за паляпшэнне ўмоў жыцця працоўных мас.

Галоўная выхаваўчая ідэя твораў Я. Коласа заключаецца ў тым каб паказаць, што сукупнасць адзначаных вышэй якасцей патрэбна чалавеку для добрых спраў на карысць іншым людзям.